


**«Я тут жыву» — так называецца новая кніга лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, галоўнага рэдактара часопіса «Вясёлка» Уладзіміра ЛІПСКАГА. У падзагалоўку выдання значыцца: «Займальныя вандроўкі па Беларусі».**

Вядомы дзіцячы пісьменнік, які працуе ў беларускай літаратуры амаль што пяцьдзясят гадоў, на аснове багатага пазнавальнага і досыць цікавага матэрыялу расказвае пра розныя адрасы нашай Бацькаўшчыны. Расказвае пра тое, што «беларусы здаўна жывуць мудрымі запаветамі прашчураў», нагадвае, што «Мая Беларусь... Гэта — трыццаць тысяч рэк. Тут некалі праходзіў шлях з «варагаў у грэкі». Гэта — азёрны край... Гэта — святы Купалле, Гуканне вясны, Дажынкі. Гэта — зубры ў Белавежскай пушчы. Гэта — бабры, мядзведзі ў Бярэзінскім запаведніку...»

Пісьменнік запрашае ў сапраўднае падарожжа па Беларусі, не забывае літаральна ні пра адзін куточак краіны, запрашае з мэтай, каб дзеці, юныя чытачы любоў да роднай зямлі спалучылі з адкрыццём гісторыі, геаграфіі, краявідаў, спадчыны, з адкрыццём цікавых людзей Беларусі — сваёй Радзімы.

Літаратурныя казкі пісьменніка спалучаюцца на старонках кнігі «Я тут жыву...» з рэбусамі-загадкамі, маляўнічай картай «Казачная Беларусь». У аповедзе пра нашу краіну Уладзімір Ліпскі выкарыстоўвае гульню, інтрыгуе чытача цікавымі, неспадзяванымі пытаннямі. Пісьменнік задае юным чытачам шмат розных загадак. Часам, каб знайсці адказы на іх, трэба зазірнуць і ў іншыя кнігі альбо прыгадаць школьныя ўрокі. Дарэчы, з кнігай «Я тут жыву: займальныя вандроўкі па Беларусі» якраз можна смела прыходзіць на школьныя ўрокі. Па гісторыі, геаграфіі, літаратуры. Найперш — зразумела, на ўрокі ў пачатковую школу, бо кніга адрасавана менавіта дзецям малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту, якія пачынаюць вывучаць родны край, яго гістарычную і духоўную спадчыну.

Добра было б, каб яе ўзялі ў рукі і бацькі. Кніга багата ілюстраваная, дзякуючы майстэрству такіх таленавітых кніжных графікаў, як І. Ліпскі, І. Пушкар, А.Аракчэева, В. Дударэнка.









